ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

# ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 37 (4269)
Нядзеля, 14 лютага 1932 г.

Менск, Савецкая 63

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВАЛ—Брыгада—важнейшае зьвяно арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.—На подступах да другой пяцігодкі.—Разгарнуць масавую падрыхтоўку да 14-ай гадавіны РСЧА.—КРАЎЧУК, ЛЕВІН Я.—Супроць фальсыфікацыі гісторыі бальшавіцкай барацьбы з апартунізмам (2 стар.).—Зм. ПАВАРОТНЫ—П'еса пра бадзёрасьць (3 стар.). П. Андроўскі. Япона-Кітайская вайна (4 стар.).

Пастанова ЦК КП(б)Б аб правядзеньні месячніка дапамогі дарожнаму будаўніцтву.—Прырост за пяцігодку—толькі 0,5 проц. (1 стар.).

Барацьбу за якасьць—у цэнтр вытворчай работы.—Па-баявому рыхтавацца да торфсэзону.—На аснове вопыту перадавікоў вывесьці Расонскі, Багомльскі і Гарадоцкі раёны з глыбокага тылу фінансавага паходу (2 ст.).

Ільнаводчыя МТС недапушчальна зацягваюць рамонт трактараў.—За 15 тавараных парасят ад кожнай сьвіні аматкі.—Працыцыплёна на чыгунках усё яшчэ нізкая (3 стар.).

АГЛЯД ДРУКУ: З вызнной сэсіяй райсуда... (3 стар.).

У імя «парадку і цывілізацыі».—Водгукі буржуазнай прэсы на прамову тав. Літвінава (4 стар.).

Апошнія весткі з фронту ілюстрыляцыі (4 стар.).

## БРЫГАДА—ВАЖНЕЙШАЕ ЗЬВЯНО АРГАНІЗАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧАГА ЎМАЦАВАНЬНЯ КАЛГАСАЎ

Пастанова ЦК УсеКП(б) ад 4 лютага «аб чарговых мерапрыемствах па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў» ставіць вузлавыя задачы, на якіх зараз павінна быць скан цэнтравана ўвага ўсёй грамадзкасьці. ЦК абавязаў кожную партарганізацыю прыступіць да **канкрэтнай** работы па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

Мала прызнаць, што арганізацыйна - гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў зьяўляецца цэнтральнай задачай, трэба па практыцы штодзённа ўмацоўваць калгасы ў іх цяперашняй арцельнай стадыі разьвіцьця, узьнімаць калгасную вытворчасьць на больш высокую ступень.

Шэсьць кораткіх сфармуляваных пунктаў, якія вызначаны ў пастанове ЦК ад 4-га лютага, павінны стаць баявой праграмай дзеньня для кожнай парт'ячэйкі, для кожнага камуніста.

Стварэньне вытворчых брыгад, падбор брыгадзіраў, укараненьне зьдзельшчыны, ліквідацыя абязьлічкі ў долгадзе жывёлы, выхаваньне калгаснага актыву, павышэньне ролі адказнасьці МТС за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў — такавы чарговыя практычныя мерапрыемствы партыі ў калгасным будаўніцтве.

Гэтыя мерапрыемствы могуць быць выкананы толькі ў бязьлітаснай барацьбе з кулацкім супывам на адсталую частку калгасьнікаў, з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, з «левацкімі» заскокамі, голым адміністраваньнем.

Адным з тыповых «левацкіх» заскокаў зьяўляецца ігнараваньне арцельнай стадыі разьвіцьця калгасаў.

Усім вядомы факты Койданаўчыны. Ня гледзячы на тое, што арцель яшчэ выстарчальна не замацавана, там аграмаджвалі дробную жывёлу: сьвіней, авечак і нават пчол, імкнуліся зусім ліквідаваць прысядзібныя землі, жадалі адным расчаркам пяра вышчыць прыватную ўласнасьць, загнаць выпрудзіць дробна-ўласьніцкую ідэалёгію з калгасьніка, адразу ператварыць яго ў камунара.

Гутаркі аб пасумяшчальнасьці індывідуальнай часткі гаспадаркі з калектыўнай, аб аграмаджваньні ўсёй жывёлы, гародаў і будынкаў маюць даволі шырокае месца сярод некаторай часткі вясковых камуністаў. Такія камуністы думаюць поўным аграмаджваньнем зьяўляюць пераходы да ўзьніцьця прадукцыйнасьці працы ў калгасах. Яны не разумеюць ленінскага вучэньня аб сялянстве, пераскакваюць праз неабходны этап.

Таму зусім невыпадкова, што ЦК яшчэ раз указаў: «Задача арганізацыйна гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў зьяўляецца ў сучасны момант, перш за ўсё, задачай разьвіцьця і ўмацаваньня арцельнай формы калгасаў». ЦК напомніў, што «спробы штучнага паскарэньня пераходу ад арцельнай формы калгасаў да камуны на цяперашняй стадыі разьвіцьця калгасаў зьяўляюцца сур'ёзнай небясьпекай».

Вядучай пануючай формай у даных умовах зьяўляецца толькі сельска-гаспадарчая арцель. У арцелі часткова засяецца прыватная ўласнасьць калгасьніка, аграмаджваюцца толькі асноўныя сродкі вытворчасьці, работа ацэньваецца па колькасьці і якасьці затрачанай працы, поўнасьцю ажыцьцяўляецца лёзунг—хто не працуе, той нічога не атрымлівае. Хто яшчэ гэтага не разумее, той нічога не разумее ў пастановах ЦК.

Разгарнуць у належнай ступені формы сельска-гаспадарчай арцелі, замацаваць яе на аснове поўнага выкананьня **ўсіх пунктаў** арцельнага статуту, аграмадзіць там, дзе яшчэ гэтага ня было зроблена, асноўныя сродкі вытворчасьці, эфэктыўна іх скарыстаць, правільна арганізаваць калектыўную працу, увесьці зьдзельшчыну, наладзіць сацыялістычнае спаборніцтва з упорам на **ўлік і кантроль** — такавы задачы ў сувязі з падрыхтоўкай да веснавой сяўбы.

**Ухапіўшыся за асноўнае зьвяно — за правільную арганізацыю вытворчых брыгад,—можна з посьпехам вырашыць усе задачы арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.**

Сустрэць трэцюю бальшавіцкую вясну ўсебакова падрыхтаванымі. Наладжана прыступіць да стварэньня па станцыях брыгад у жывёлагадоўчых, ільнаводчых, садова-гародных калгасах з пастаянным колькасьцю людзей, з прымацаваньнем да іх сродкаў вытворчасьці.

За стачонышча і правільнае выкарыстаньне цягавай сілы інвэнтару, на шэр у часе палявых работ брыгада нясе поўную адказнасьць. Кожнаму каню, машыне—пільнае гаспадарчае вока. Зьнішчэньне абязьлічкі значна захавае сродкі вытворчасьці, дасьць большую эфэктыўнасьць.

Брыгады, як правіла, працуюць на поўных вызначаных ім зямельных вучастках, прымаюць удзел ва ўсім вытворчым працэсе, пачынаючы ад пачатку сяўбы да канца ўборкі і зьбіцьця. Ужо цяпер кожная брыгада, выходзячы з агульнага калгаснага пляну, павінна распрацаваць план сяўбы свайго вучастку, абгаварыць яго на вытворчых нарадах, намеціць канкрэтныя агратэхнічныя мерапрыемствы па ўзьнятьці ўраджайнасьці. Чым больш ўраджай атрымаецца з вучастку, тым вышэй ацэньваецца работа ўсёй брыгады.

Разам з тым трэба папярэдзіць ад некаторых ікодных памылак, якія могуць быць дапушчаны калгасамі пры стварэньні пастаянных брыгад. Нельга падыходзіць з адной меркай да кожнай гаспадаркі. Сярэдняя велічыня калгасу ва ўмовах БССР—39 двароў, ёсьць па 300 і па 15-20 двароў. У залежнасьці ад мясцовых умоў, ад велічыні і арганізаванасьці калгасаў прыдзецца стварыць брыгады і не па ўвесь сельска-гаспадарчы сэзон, а толькі на **пасобны пэрыяд** сельска-гаспадарчых работ (ворыва, касавіца, уборка). Але-ж кожная брыгада абавязкова павінна быць забясьпечана пастаянным **ядром**, вакол якога канцэнтруюцца іншыя члены брыгады.

Палявыя работы патрабуюць **гібкасьці і манэўровасьці.** Праўленьні калгасаў павінны штодзённа ведаць, асабліва ў гарачую пару, у якую брыгаду колькі людзей трэба дадаць для своячасовага і добраякаснага выкананьня кожнага заданьня.

Арганізацыя пастаянных і сэзонных вытворчых брыгад, правільная расстаноўка сіл у кожнай брыгадзе, рацыянальнае выкарыстаньне сродкаў вытворчасьці, ліквідацыя абязьлічкі і ўраўнілаўкі—пазбавіць тых значных страт, якія мелі калгасы ў 1931 г.

Работы брыгад, іх энэргія, вытворчая актыўнасьць у значнай ступені залежаць ад складу брыгадзіраў—пізавых камандзіраў калгаснай вытворчасьці. Трэба раз назаўсёды пакончыць з цяпучасьцю, механічным падыходам, «парговасьцю» у назначэньні брыгадзіраў. Брыгадзір арганізуе работу, сам паказвае прыклад, як па-ўдарнаму трэба працаваць брыгадзе.

Калгасы павінны **падабраць вопытных пізавых камандны склад** з лепшых ударнікаў, якія разумеюць дэталі сельска-гаспадарчай вытворчасьці сваёй галіны, хварэюць за гаспадарку, нясуць за яе адказасьць перад праўленьнем калгасу. Праз кароткатэрміновыя курсы павысіць кваліфікацыю брыгадзіраў, дапамагчы ім распрацаваць планы на час палявых работ, вызначыць кожнаму калгасьніку яго месца і ролю ў сяўбе.

Укараненьне зьдзельшчыны, выпрацоўка норм на ўсе віды работ, дакладны ўлік колькасьці і якасьці працы кожнага калгасьніка, ацэнкай у працадніх застаецца асноўнай задачай і на далейшы час. Своячасовае прыцягненьне, размеркаваньне дакладаў выключна па працаднёх замацуе зьдзельшчыну, яшчэ больш узьніме прадукцыйнасьць працы ў калгасах.

Аднак, у сваёй пастанове «ЦК перасьцярагае ад прымяненьня ўскладненьня форм зьдзельшчыны, увядзеньня прагрэсыўнай зьдзельшчыны, захаваньня індывідуальнымі формамі зьдзельшчыны, там, дзе гэта не выклікаецца ўмовамі вытворчасьці». Формы зьдзельшчыны павінны быць самыя простыя, элементарныя, даступныя для разуменьня кожнага калгасьніка.

Вопыт паказаў, што самай лепшай формай зьяўляецца брыгадная зьдзельшчына з персанальным улікам колькасьці і якасьці працы кожнага калгасьніка. Прычым брыгада ў цэлым павінна дапамагчы брыгадзірам наладзіць як колькасны, так і асабліва якасны ўлік працы калгасьнікаў. Без дакладнага ўліку зьдзельшчына ператвараецца ў падзёншчыну, стварэньне ўмовы для панаваньня ўраўнілаўкі. Пры актыўным удзеле калгасных мас праўленьні калгасаў змогуць увесьці не фармальную, а **сапраўдную** зьдзельшчыну, дабіцца поўнай ліквідацыі ўраўнілаўкі.

Адным з чарговых мерапрыемстваў, высунутых Цэнтральным Камітэтам, зьяўляецца павышэньне ролі адказнасьці МТС за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, стварэньне калгаснага актыву, павышэньне ўраджайнасьці. МТС не прыкатныя пункты. МТС—прадпрыемствы пасьлядоўна сацыялістычнага тыпу. **МТС—арганізатар калгаснай вытворчасьці** на аснове мэханізацыі сельскай гаспадаркі, разгортваньня сацыялістычных форм і мэтадаў працы. ЦК прапанаваў усім партарганізацыям «узмацніць кіраўніцтва ўсёй гаспадарчай работай МТС». Больш увагі, штодзённай дапамогі дырэкцыям машына-трактарных станцый.

Падрыхтоўка да веснавой сяўбы — сяўбы апошняга году першай пяцігодкі, выклікае шалёнае супраціўленьне кулацтва, якое ліквідуецца, як клас, на базе суцэльнай калектывізацыі. Кулак розными формамі і мэтадамі імкнецца разбурыць калгасы з сярэдзіны, дэзарганізаваць усю калгасную вытворчасьць, сарваць падрыхтоўчую работу.

Больш класавай пільнасьці! Задача партарганізацый — мабілізаваць калгасныя масы на яшчэ большую барацьбу з класавым ворагам, на штодзённую **ачыстку** калгасаў ад кулакоў.

Непосячы жорсткі адпор класаваму ворагу—кулаку і яго агентам—правым і «левым» апартуністам, на аснове поўнага ажыцьцяўленьня дырэктыў ЦК УсеКП(б) па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў—да новых больш **грунтоўных** перамог у далейшым ахопе батрацка-сярэднясялянскіх мас калектывізацыяй, на фронце трэцяй бальшавіцкай вясны!

## ПРЫРОСТ ЗА ПЯЦІДНЁЎКУ—ТОЛЬКІ 0,5 ПРОЦ.

**Узмацненьне масавай работы на аднаасобным сэктары, рашучы націск на кулака—важнейшая ўмова павышэньня агульных тэмпаў ільназагатовак**

### Шырэй масава-палітычную работу

Другая пяцідзёўка лютага дала далейшае зьніжэньне тэмпаў ільназагатовак. Прырост складае толькі 0,5 проц. Гадавы план загатовак на 10 лютага выкананы на 54,1 проц. Аднаасобны сэктар план выканаў толькі на 37,5 проц. Ён зьяўляецца асноўным тормазам кампаніі. Далёка ня выканалі свае абавязкі перад дзяржавай і калгасы. Так, па лініі МТС план выкананы на 55,6 проц. і па іншых калгасах — на 77,4 проц.

Масава-палітычная работа зьяўляецца надзвычай слабым месцам у ільназагатоўчай кампаніі. У паасобных раёнах, напрыклад, Гарадоцкім, правапартыйнымі і «левацкімі» агентамі кулака майструюцца «тэорыі» аб тым, што масавая работа сябе не апраўдала, што патрэбны адміністрацыйны націск на сярэдняка і бедняка, што кулак і заможнік ужо страцілі сваю сілу і г. д.

Гэтыя «тэорыйкі» на практыцы прывялі да перагібаў у адносінах да сярэдняка і бедняка, што кулак і заможнік ужо страцілі сваю сілу і г. д.

Гэтыя «тэорыйкі» на практыцы прывялі да перагібаў у адносінах да сярэдняка і бедняка, да патураньня кулаку, да зрыву плянаў загатовак. Правапартыйнымі скажэньнямі, «левацкім» загібам трэба даваць бязьлітасны бальшавіцкі адпор.

Узмацненьне масава-палітычнай работы сярод калгасьнікаў, беднякоў і сярэднякоў—аднаасобнікаў, барацьба з кулацка-ўваццкімі тэндэнцыямі, рашучы націск на кулака — неабходная ўмова пасьпяховага выкананьня плянаў ільназагатовак.

### Бальшавіцкі адпор „левацкім" скажэньням лініі партыі

ГАРАДОК (Наш спецкор).

Тэмпы ільназагатовак па Гарадоцкім раёне недапушчальна зьнізіліся. Дзякуючы штурму, які праводзіўся ў раёне, на даў пералому. На 5 лютага па валакно загатоўлена 36,11 проц. гадавога пляну, па ільнасеі—57,36 проц.

Наперадзе ідуць калгасы і МТС, якія план выканалі па ільнасеі—на 103,5 проц. і па валакне—на 74 проц. Адстаюць іншыя калгасы, якія злажі сеяны—83,23 проц. і ільнавалакна—41,22 проц. **Ганебна адстае аднаасобны сэктар,** па якім план загатовак сеяны выкананы на 29,77 проц. і па валакне—на 22,67 проц. Па цьвёрдых заданьнях спатканна ільнасеяна—29,53 проц. і валакна толькі—13,75 проц.

Адставаньне аднаасобнага сэктару і слабы націск на кулацка-заможныя гаспадаркі зьяўляюцца вынікам правых і «левацкіх» скажэньняў лініі партыі ў паасобных сельсаветах і некаторых раённых арганізацыях. Старшыня райкалгасаюзу Мельнікаў на бюро РК і прэзыдыуме райКК імкнуўся даказаць, што «жаласная работа сябе не апраўдвае па ільназагатоўках, што трэба прымаць адміністрацыйныя меры ў адносінах да сярэдняка і бедняка».

Кулакі зараз на вёсцы, па думцы Мельнікава, не адпрываюць ніякай ролі. «Левацкія» «тэорыйкі» Мельнікаў ператвараў у практыку, правозіў чы вобыскі ў бядняцкіх і сярэдняцкіх гаспадарках, патураючы адпаведна кулаку.

Практычна-масавая работа сярод калгасьнікаў, беднякоў і сярэднякоў-аднаасобнікаў падрываліся ў раёне спэцкі адміністрэваньнем. Райкалгасаюз не вядзе барацьбы з кулацка-спэкулянцкімі настроямі ў адсталай частцы калгасьнікаў.

У калгасе імя Калініна, Пролетарскага сельсавету, старшыня калгасу Афанасьеў разьмеркаваў сярод калгасьнікаў 384 цэнтн. добраякаснага валакна ў той час, як план загатовак выканан на 38 проц. Праўленьні рвацца-спажывецкіх настроіў мелі месца ў калгасах «Новы сьвет», «Чырвоная Барчоўчына», «Калектыўнік» і інш.

Правапартыйным скажэньням, «левацкай» практыцы патрэбна паносці руйнуючы адпор. На аснове разгортваньня масава-палітычнай работы партарганізацыя Гарадоцкічыны павінна мабілізаваць масы калгасьнікаў, беднякоў і сярэднякоў—аднаасобнікаў на барацьбу з кулакам - рвацкімі тэндэнцыямі, на барацьбу за стопроцантнае выкананьне плянаў загатовак.

М. Вінкеўскі.

### Валакно разбазарваюць „на мясцовыя патрэбы"

**КАПЫЛЬ. (Наш кар.).**

Гадавы план здачы дзяржаве ільнавалакна на 5 лютага па Капыльскім раёне выкананы на 21,4 проц.

Па радзе сельсаветаў (Капыльскі, Браткаўскі) да вёсак не даведзены планы. У адносінах да кантрактантаў, якія злосна ўхіляюцца ад выкананьня ўзятых на сябе абавязкаў па здачы ільну, ня прымаецца ніякіх мер. Як вынік, **планы загатовак на аднаасобным сэктары выкананы толькі на 10 проц.**

Кулацка - заможныя гаспадаркі пры патураньні работнікаў асобных сельсаветаў, сабатуюць выкананьне заданьня. Па Пукаўскім і Вапелеўскім сельсаветах, напрыклад, **цьвёрдыя заданьні спагнаны на 3 проц.**

У радзе калгасаў Бабаўнянскага і Браткаўскага сельсаветаў лён разбазарваецца на розныя мясцовыя патрэбы — па «мянкі», на «вяроўкі» і г. д. Парт'ячэйкі і сельсаветы не даюць належнага адпору гэтым скажэньням і ўваццкім тэндэнцыям. Шырокія масы калгасьнікаў, беднякоў і сярэднякоў—аднаасобнікаў не мабілізаваны на 100-проц. выкананьне пляну.

Не паказала сапраўднай барацьбы за лён і **Капыльская МТС,** якая свой гадавы план выканала менш, чым на **50 проц.**

Трэба зараз-жа перабудаваць усю работу на перапрацоўцы і загатоўках ільну. Неабходна ўсталяваць капрэтнае кіраўніцтва і кантроль за выкананьнем пляну загатовак.

А. В.

### Калгасы Брагіншчыны поўнасьцю выканалі план

**БРАГІН.**

На сацыялістычным сэктары Брагінскага раёну план ільназагатовак выкананы на 100 проц. **Калгасы Малейскаўскага сельсавету свой план выканалі на 120 проц.**

Гэтыя посьпехі забясьпечаны тым, што на пераапрацоўку ільну былі выдзечаны пастаянныя брыгады, праўленьні калгасаў забясьпечылі іх бесперабойную работу і наладзілі правільны ўлік працы.

**Недапушчальна адстае па ўсім раёне аднаасобны сэктар, які на 1 лютага план выканаў толькі на 30 проц.**

Дзятлоўскі.

### Змагаюцца за выкананьне сустрэчных плянаў

**ДУБРОЎНА.**

Сазонкаўскі сельсавет план ільназагатовак выканаў на 97,3 проц. Цьвёрдыя заданьні з кулацка - заможных гаспадарак спагнаны поўнасьцю.

Аквінацыя пераробных калгасаў, якія пераапрацоўку і здачу ільну скончылі яшчэ 28 студзеня, зараз высунулі сустрэчныя пляны і змагаюцца за іх выкананьне.

М.

## Пастанова ЦК КП(б)Б аб правядзеньні месячніка дапамогі дарожнаму будаўніцтву

Улічваючы, што работы па дарожным будаўніцтве пачаты з вялікім спазьненьнем, у выніку чаго ўжо маецца прарыў у галіне загатовак і вывазцы асноўных буданўнічых матар'ялаў, што стварае пагрозу зрыву дарожна-будаўнічай праграмы 1932 г., ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Абвясьціць з 15-га лютага па 15 сакавіка месячнік ліквідацыі прарыву на дарожным будаўніцтве, прыцягнуўшы да актыўнага ўдзелу ў правядзеньні месячніка шырокія колы пролетарскай грамадзкасьці і працоўных вёскі.

2. У якасьці асноўнай задачы месячніка пастаўіць поўную вывазку пэтрэбнай колькасьці каменьня, пяску, гравія і лесаматар'ялаў для патрэб дарожнага будаўніцтва і палепшэньня дарог мясцовага значэньня.

3. ГК і РК КП(б)Б узяць пад свае кіраўніцтва правядзеньне месячніка, мабілізуючы прафэсіянальныя, камсамольскія і грамадзкія арганізацыі, стварыўшы на мясцох штабы па правядзеньні месячніка.

4. Абавязаць ГК і РК КП(б)Б, Галоўдартранс, ЦК Аўтадор, ПСПСБ, ЦК ЛКСМБ, Калгасцэнтр і ЦП Саюзу чыгуначнага, шосавага і портавага будаўніцтва распрацаваць планы і паралак прыцягненьня грамадзкасьці да ўдзелу ў месячніку, пасьлядна распачаўшы мабілізацыю мас вакол задачы месячніка.

5. Абавязаць Галоўдартранс БССР у двухдзённы тэрмін распрацаваць і апублікаваць сыстэму прэміраваньня за лепшае правядзеньне месячніка, вылучыўшы для гэтай мэты адпаведныя фонды.

6. Сэктару другу ЦК КП(б)Б у трохдзённы тэрмін распрацаваць і разаслаць план удзелу пярэдычнага другу ў правядзеньні месячніка.

7. Для кіраўніцтва правядзеньнем месячніка і кантролю выкананьня гэтай пастановы арганізаваць штаб пры ЦК КП(б)Б у складзе т. т. Гаруновіча, Пэўзнэра, Фрумкіна, Плоткіна і прадстаўнікоў ПСПСБ, ЦК ЛКСМБ і Калгасцэнтру.

## НА ПОДСТУПАХ ДА 2-й ПЯЦІГОДКІ

Пастановы XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі знаходзяць жывейшы водгук сярод партыйных і беспартыйных рабочых і калгасных мас. Сходы партактыву раёнаў Масквы і Ленінграду, якія толькі што адбыліся, з **поўным аднадушшам ухвалілі пастановы канфэрэнцыі,** адзначылі вялізарныя посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва і ўзялі на сябе канкрэтныя абавязацельствы па выкананьні задач бягучага, заключнага году першай пяцігодкі, які зьяўляецца подступам да 2-й пяцігодкі, **пяцігодкі пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.**

Важнейшым вынікам разгортутага сацыялістычнага наступленьня, праведзенага партыяй за перыяд ад XVI зьезду да 17-й канфэрэнцыі, зьяўляецца канчатковы падрыў карэньня капіталізму ў вёсцы, які прадрашае поўную ліквідацыю капіталістычных элементаў і поўнае зьнішчэньне клясаў у 2-й пяцігодцы. Важныя і складаныя задачы ўстаюць перад партыяй, рабочай клясай і ўсімі працоўнымі краіны ў чацьвертым, завяршаючым годзе пяцігодкі. Прамфінплян гэтага году павінен быць ня толькі выкананы, але і перавыкананы. Мы з усёй настойлівасьцю павінны змагацца за выкананьне і перавыкананьне вытворчых і будаўнічых праграм па ўсёй прамысловасьці і **першую чаргу па чорнай мэталюргіі, вугалі і машынабудаўніцтве.** Мы павінны з усёй энэргіяй біцца за кожную тону выплаўленага мэталю, за кожную тону здабытага вугалю, за кожную новую машыну,—такава цэнтральная задача сёпеняшняга дня. Само сабою зразумела, што з гэтым зьвязана выкананьне і перавыкананьне плянаў і па ўсіх іншых галінах нашай народнай гаспадаркі, у тым ліку па каляровай мэталюргіі, і прамысловасьці, транспарце.

Разгортваючы лёгкую і цяжкую індустрыі, разьвіваючы савецкі гандаль, мы тым самым будзем паскараць шэйшае павышэньне матар'яльна-бытавога і культурнага ўзроўню рабочых і калгасных мас, выкананы з дырэктывы XVII партканфэрэнцыі аб тым, што забясьпячэньне насельніцтва асноўнымі спажывецкімі таварамі і ў тым ліку прадметамі харчаваньня павінна да канца 2-й пяцігодкі павялічыцца ня менш, чым у 2-3 разы супроць канца першай пяцігодкі.

Для далейшай сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі вылючнае значэньне мае пастанова ЦК ад 4-га лютага аб чарговых мерапрыемствах па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў. Даючы рашучы адпор спробам пераходу ад арцельнай формы калгасаў да камуны на сучаснай стадыі разьвіцьця калгасаў, мы павінны максымальную ўвагу згуртаваць на разьвіцьці і ўмацаваньні работы брыгады, якое зьяўляецца важнейшым зьвяном у арганізацыі працы ў калгасах. Без разьвіцьця і ўмацаваньня брыгады немыслімы пасоўванцы наперад. Найменшая недаацэнка значэньня брыгады нямінуча прывядзе да аслабленьня барацьбы за завяршэньне ў асноўным сацыяльнай калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва як класы ў 1932-33 г.

Бягучы год павінен быць годам **рашучага ўзмацненьня барацьбы за якасныя паказальнікі ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі—у прамысловасьці, на транспарце і ў сельскай гаспадарцы.** На ступені выкананьні пляну зьніжэньня сабекошту, павялічэньня прадукцыйнасьці працы і павышэньня якасьці прадукцыі, на ступені ажыцьцяўленьня 6 указаньняў **тав. Сталіна,** партыя будзе меркаваць аб рабоце кожнай партарганізацыі і кожнага камуніста ў паасобку.

Галоўнай прадпасылкай пасьпяховага ажыцьцяўленьня ўсіх задач, што стаяць перад намі, застаецца і надалей непрыкрытая барацьба за лінійную палітыку ў нашай партыі супроць найменшых скажэньняў гэтай палітыкі. Правільнасьць генэральнай лініі нашай партыі і яе ЦК даказана ўсім ходам, усёй практыкай сацыялістычнага будаўніцтва. Поўнасьцю апраўдалася лінія партыі за перапрацоўцы нашай краіны з аграрнай у індустрыяльную, за ўзорным цяжкай індустрыі і разгортваньне вырабу сродкаў вытворчасьці. Поўнасьцю пацьвердзілася лінія партыі па разьвіцьці саўгасаў, супольную калектывізацыю і ліквідацыю на яе аснове кулацтва, як класы. І паатварот, поўнае пацьмяньне падпрыпела буржуазная «тэорыя» трацкістаў, якія абгрунтаваліся ў авангард буржуазнай контрреволюцыі, аб немагчымасьці пабудовы сацыялізму ў нашай краіне і нямінучасьці рэстаўрацыі капіталізму.

Поўнае пераможнае наступленьне кулацкага ідэалёгіі правай апазыцыі, лінія якой вяла да простай капітуляцыі перад кулацтвам і буржуазнымі элементамі. Рашучая барацьба з апартунізмам застаецца ў асноўным прадпасылкай далейшых посьпехаў сацыялістычнага будаўніцтва. Без гэтай барацьбы мы не забясьпечым выкананьня тых гістарычных задач, што стаяць перад намі. Той, хто прыпісвае выкананьне задач сацыялістычнага будаўніцтва барацьбе з апартунізмам, той, хто залыляе, што барацьба з апартунізмам аслабляе партыю ад выкананьня прамфінплану, грае на руку клясаваму ворагу. Найменшае аслабленьне пільнасьці ў адносінах да апартуністаў дапамога ворагу і перш за ўсё кулацтву, якое разгромлена, але яшчэ канчаткова не ліквідавана.

З таго важнейшага палітычнага вывіку, што пытаньне «хто каго» ў нашай краіне вырашана, што мы ідзем да бясклясавага грамадзтва, некаторыя таварышы могуць зрабіць прыправільны вывад, што небясьпека апартунізму прайшла, **што можна аслабіць барацьбу з апартунізмам. Зусім відавочна немарксьцкая, э антыленінская сутнасьць падобнага роду цьверджаньняў.**

Мы ні на хвіліну не павінны забываць тэй акалічнасьці, што клясы яшчэ не зьнішчаны, што клясавая барацьба ня спынілася. **Ня спыніцца клясавая барацьба і ў другой пяцігодцы.** Толькі апартуністы могуць прапаведаваць, што па сацыялізму мы прыйдзем без цяжкасьцяй, **што ў другой пяцігодцы наступіць «плаўны ход разьвіцьця».** Падобныя «тэорыйкі» ня маюць нічога супольнага з поглядамі нашай партыі. Ленін вучыў партыю, што клясы зьнішчаюцца толькі пілігам жорсткай клясавай барацьбы.

Перад намі стаіць задача перамаганьня буржуазных і дробна-буржуазных забабонаў і звычаяў мільёнаў людзей, задача сацыялістычнага перавыхоўваньня мільёнаў працоўных.

Мы ня можам забываць і тэй акалічнасьці, што пытаньне «хто-каго» ня вырашана яшчэ ў міжнародным маштабе і што ў імпэрыялістычным лягеры ўзмацняецца зараз антысавецкая актыўнасьць. Шлях да бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва—шлях ня лёгкі. Ён ляжыць праз далейшае ўмацаваньне ўсёй сыстэмы пралетарскай дыктатуры, якая канчаткова зьнікне пры поўным камунізьме, праз далейшае ўмацаваньне лепінскай партыі, праз барацьбу ня з усімі рознавіднасьцямі апартунізму. Галоўнай небясьпекай унутры партыі застаецца правы ўхіл.

**«Рэалізацыя грандыёзных задач другой пяцігодкі,** — напісаў зьвяцца ў рэзалюцыі партактыву чырвонай Прэсьні,—**патрабуе няўхільнай барацьбы партыі на два фронты, асабліва супроць правага ўхілу, які выступае супроць бальшавіцкіх тэмпаў, які зьяўляецца агентурай кулака і які застаецца на сучасным этапе галоўнай небясьпекай».** Сходы заклікалі таксама партыйныя масы на барацьбу з «левымі» праўленьнямі апартуністу, прымяшчтвам да апартунізму ўсіх масьцей, з галаваторкаваньнем ад посьпехаў, з гнілым лібералізмам.

Сходы яшчэ раз пратэманстравалі згуртаванасьць радоў вакол лепінскага ЦК на чале з тав. Сталіным, які вядзе рабочую клясу да поўнай перамогі сацыялізму СССР і тым самым да пасьпяховага перамогі пралетарскай рэвалюцыі ва ўсім сьвеце.

Усё гэта зьяўляецца лепшай запрукай таго, што **пастановы XVII партканфэрэнцыі, якія даюць праграму за вершэньня пяцігодкі ў 4 гады, і пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва ў другой пяцігодцы будуць намі выкананы, ня гледзячы на шалёнае супраціўленьне клясавых ворагаў і апартуністаў, на гледзячы на злосьць і нянавісьць капіталістычнага сьвету да краіны пралетарскай дыктатуры.** («Правда»).

## РАЗГАРНУЦЬ МАСАВУЮ ПАДРЫХТОЎКУ ДА 14 ГАДАВІНЫ РСЧА

23 лютага споўніцца 14 год існаваньня Рабоча-Селянскай Чырвонай армії. Наша армія — армія дыктатуры пралетарыяту, армія сусьветнай пролетарскай рэвалюцыі. Яе слаўная гісторыя — важнейшы этап гісторыі рэвалюцыйнай барацьбы рабочай клясы Савецкага Саюзу, барацьбы за замацаваньне перамог чырвонага Кастрычніка, за ахову набудовы сацыялістычнага грамадзтва.

Палыхаючую гатовасьць вартаўніка межаў краіны Саветаў — Чырвонай армії — усе савецкая грамадзкасьць сустракае з вялізарнейшым натхненьнем і энтузіязмам. Гэта гатовасьць праходзіць на ўмовах падзвычай выразна акрэсьленых, вельмі наглядных супярэчнасьцяй паміж сыстэмай капіталізму і сыстэмай сацыялізму.

У той час, як капіталістычны сьвет перажывае катастрафічны крызіс, без упынку рост беспрацоўя, які штурхае шматмільённыя працоўныя масы на галечу і жабрацтва, — у краіне Савецкага Саюзу на аснове ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі небачаныя ў гісторыі тэмпы разьвіваецца індустрыя, з посьпехам ажыцьцяўляюцца задачы сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Наша краіна, як краіна сацыялістычнага будаўніцтва, ня ведае беспрацоўя. У ёй пазьлегчэй ліквідацыю растуць і разьвіваецца творчыя сілы. На аснове посьпехаў сацыялістычнага будаўніцтва паўсюдна паляпшаецца дабрабыт рабочых і калгасных мас.

Завяршыўшы ў мінулым годзе набудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі Савецкага Саюзу, партыя, пад кіраўніцтвам лепінскага ЦК, на чале з тав. Сталіным, забясьпечыла поўнае выкананьне лепінскага плянтаньня «хто каго» на карысьць сацыялізму і ў горадзе і ў вёсцы. Гэта асноўная прадпасылка для ажыцьцяўленьня гістарычных задач, выкананых XVII усесаюзнай партканфэрэнцыяй, — набудовы ў другой пяцігодцы сацыялістычнага грамадзтва, канчатковай ліквідацыі капіталістычных элементаў і клясаў паогул і поўнага зьнішчэньня прычын, якія парадзяюць клясавыя розьніцы і эксплёатацыю.

Зусім зразумела, што выкананьне гэтых гранцыёзных задач будзе і ў далейшым сустракаць шалёнае супраціўленьне клясава-варожых элементаў унутры краіны, розных правакацыі і спробы да нападу на Савецкі Саюз з боку імпэрыялістычнага лягеру. Капіталізм шукае выхаду з свайго тупіку ў падрыхтоўцы новых войнаў, і ў першую чаргу ў падрыхтоўцы інтэрвэнцыі супроць Савецкага Саюзу. Ніякая балбатня капіталістычных заправіл аб разбраеньні не захавае іх сапраўдных намераў і дзеяньняў. Падсці на Далёкім Усходзе зьяўляецца адным са зьвеньняў у сыстэме правакацыі імпэрыялізму супроць Савецкага Саюзу.

Усё гэта абавязвае нас з яшчэ большай энэргіяй умацоўваць абароназдольнасьць краіны, яшчэ на больш высокую ступень узьнімаць баявую магутнасьць Чырвонай армії, якая зьяўляецца фактарам буйнейшага значэньня ў справе забясьпячэньня мірнага сацыялістычнага будаўніцтва. Пад гэтым асноўным лёзунгам будзе праходзіць сьвяткаваньне 14-ай гадавіны Чырвонай армії.

На прадпрыемствах, у калгасах, саўгасах неабходна зараз-жа шырока разгарнуць масавую работу па падрыхтоўцы да дня Чырвонай армії, растлумачваючы міжнародзнае і ўнутранае становішча СССР, ролю Чырвонай армії ў абароне сацыялістычнага будаўніцтва, шырока папулярызуючы яе слаўныя баявыя традыцыі.

Разам з тым трэба ўсебакова праверыць работу ячэек Асоавіяхіму на вялізацыі мас, паколькі рэгулярна правоўцца заняткі у гуртках вайсковых веданў і заняткі камандзіраў СПА, ці ў выстарчальнай меры выкарыстоўваецца ў гэтай справе начскład запасу, паколькі замацаваны і ў далейшым разьвіваецца тыя посьпехі абаронай работы, якія набыты ў часе правядзеньня ў разве гэтай работы у мінулым годзе манэўраў супрацьпаветранай абароны. Канкрэтным вынікам гэтай

# БАРАЦЬБУ ЗА ЯКАСЬЦЬ—У ЦЭНТР ВЫТВОРЧАЙ РАБОТЫ

„Асабліва вострая неабходнасьць у бягучым годзе ў мабілізацыі ўсіх унутраных рэсурсаў прамысловасьці... патрабуе выключнай увагі да якасных паказальнікаў"
(З рэзалюцыі XVII партканфэрэнцыі па дакладу тав. **Арджанікідзэ**)

## Менская абутковая фабрыка выпускае дрэнную прадукцыю

З-за дрэннай якасьці прадукцыі менская абутковая фабрыка за 11 месяцаў 1931 г. страціла ў чатыры разы больш, чым за ўвесь 1930 год.

Паводле афіцыяльных вестак, плян па якасьці прадукцыі выкананы на 95,67 проц., г. зн. адхіленьні ад першага гатунку складалі 4,33 проц. Але гэта лічба значна павялічылася-б, калі-б фабрыка не ўхітрылася выдаваць абутак другога і трэцяга гатунку за першы; з правераных 60 пар з кляймом першага гатунку аказалася 28 пар другога і трэцяга.

У параўнаньні з 1930 годам брак значна павялічыўся. У 1930 годзе ён складаў 0,53 проц., у лістападзе 1931 году—0,83 проц., за 11 месяцаў таго-ж году—1,42 проц. Задачыне па зьніжэньні сабекошту прадукцыі за кошт палепшэньня якасьці на 0,63 проц. таксама не выканана. Замест зьніжэньня сабекошту ёсьць павялічэньне на 3,67 проц. супроць пляну.

Вогульні спажыўцоў гавораць аб дрэннай якасьці абутковай прадукцыі. Напрыклад, работнікі Смаленскага ЗВК скардзіліся, што зацікі дзіцячага абутку на вышыні роўнага мужчынскаму, набіўка падэшвы—родная, абпасы адыходзяць і г. д.

Камісія ЦКК-НК РСІ і ВСНГ БССР абсьледавала факты, прыведзеныя ў лісьце Смаленскага ЗВК. Факты гэтыя пацьвердзіліся. Камісія выявіла рад недахопаў у работе фабрыкі. Пры выдачы скур закройшчыкам пачкі дрэнна пагбіраюцца па моцнасьці і гатункавасьці; закройшчыкі часта кроюць «пад мадэлі», зьвугамі. Некаторыя формы мадэляй не адпавядаюць адна па другой. Брусоўка робіцца без кантролю; паскі клеяцца не паводле метак, у сувязі з чым адзін пасок вышэй за другі. Абіжжыкі не карыстаюцца цыркулямі для вымерваньня даўжыні паска. Улік браку па працэсах не вядзецца; пераробкі робяцца за лік фабрыкі. На многіх працэсах зусім няма кантралёраў; апошнія нізкіх інструкцый не атрымліваюць. Прэміяваньне за зьмяншэньне браку па ажыцьцяўленьцца. Не правяраюцца вылікі з прыёмшчыкаў і кантралёраў за прапушчаны брак. Не наладжаны выстаўкі браку. Масавая работа вакол якасьці прадукцыі не наладжана. Троба зараз-жа ўзмаціць кантроль па ўсіх працэсах, распрацаваўшы пастаянныя інструкцыі; устанавіць правільны ўлік працы, ажыцьцявіць матар'яльную адказнасьць тых, хто псуе прадукцыю, увесьці пастаянны падбор пачак скур для закройшчыкаў, праверыць дакладнасьць усіх мадэляй па закройным аддзяленьні. І, нарэшце, неабходна праз вытворчыя нарады і шматтыражку фабрыкі мабілізаваць увагу рабочых на барацьбу з «бракаробамі».

**ШЫШЛА.**

## ЗЬНІШЧЫЦЬ БРАК У ЛІЦЬЦІ ДЭТАЛЯЙ С.-Г. МАШЫН

**ВІЦЕБСК.** Адной з асноўных прычын недавыкананьня прамфінпляну **заводу «Чырвоны мэталіст»** зьяўляецца выліскі брак прадукцыі, асабліва па ліцьці машын і пасобных дэталяй. Пры алсутнасьці хоць-бы аднадзеннага запасу адлітых дэталяй, гэта адчына адбіваецца на вытворчай рабоце. Найбольшы процант браку даюць фармоўшчыкі, што тлумачыцца наборам некваліфікаваных рабочых і адсутнасьцю належнага тэхнічнага кіраўніцтва і кантролю.

Вось некалькі лічбаў, якія характарызуюць становішча з якасьцю прадукцыі па заводзе «Чырвоны мэталіст».

Ліцейны цэх за час з 11 па 20 студзеня даў 11,5 проц. браку па ліцьці дэталяй жмыхадрабілак, 13,4 проц.—па корыцах, 18,8 проц. браку па бульбакапалках, 28 проц.—па сячкарнях і 8 проц.—па плугах «Эбэргарда». Наогул, сярэдні процант браку ў ліцейным цэху дасягае 14 проц.

Перад завоцкімі арганізацыямі стаіць баявая задача — палепшыць якасьць прадукцыі, памятаючы, што найменная хіба ў ліцьці дэталяй с.-г. машын і запасных частак самым адмоўным чынам адбіваецца на рабоце машын у часе пасеўнай кампаніі і ўборачнай кампаніі.

**С.**

## Даць шпалернай фабрыцы лепшы сырэц

Нядаўна менскае бюро па стандартызацыі правяло абсьледаваньне якасьці прадукцыі **менскай шпалернай фабрыкі імя Вароўскага.** Абсьледаваньне выявіла наступнае:

Пры фабрыцы існуе лябараторыя, якая займаецца падборам фарбаў, патрэбных фабрыцы. Аднак, яна не займаецца аналізам сырцу і гатовай прадукцыі, бо ня мае патрэбнага абсталяваньня.

Фабрыку забясьпечвае сырцом папяровая фабрыка «Чырвоная зорка» (Чашнікі). З апошняй заключан дагавор на дастаўку добраякаснага стандартнага сырцу. Аднак, фабрыка за апошні час дастаўляла сырэц вельмі дрэннай якасьці, з парушэньнем устаноўленага стандарту.

Белая папера, якая прыбываецца з Чашнікаў, мае розны колер, у выніку чэльга выпускаць стандартных белых шпалераў. Парушаюцца і памеры—замест паперы ў 50 см. шырынёй атрымліваецца папера ў 70 см., ліпшак у 20 см. прыходзіцца адрэзаць.

Спэцыяльнага інстытуту бракераж, на які было-б усклацзена адказнасьць і кантроль за якасьцю прадукцыі, на фабрыцы няма.

Няма цэставых фарбаў, неабходных для палепшэньня якасьці малюнкаў.

Адсутнічае фільтр-прэс для выпрабаваньня зробленай фарбы; прамыўка крэйды нездавальняючая. Няма спэцыяльнай пілкі для рэзкі паперы, што адмоўна адбіваецца на якасьці шпалер.

Троба адзначыць, што да апошні час на фабрыцы шмат чаго зроблена ў палепшэньні якасьці прадукцыі. Значна зьніжан процант браку—з 0,5 проц. паводле пляну да 0,1 проц.—0,2 проц.

Шырока пастаўлена рацыяналізатарская работа. Дзякуючы ўвядзеньню новай канструкцыі, фабрыка перайшла з 7-мэтравых кавалкаў шпалеры на 21-метравыя, што выклікала рост прадукцыйнасьці працы ў тры разы. Скарыстоўваюцца адыходы; некаторыя дэфіцытныя поўфабрыкаты заменены сурагатамі.

Выразнае ажыцьцяўленьне па фабрыцы шасьці ўмоў тав. Сталіна і шырока разгорнутая рацыяналізацыя далі магчымасьць фабрыцы выкананьць пяцігодку за тры гады.

Неабходна на шпалернай фабрыцы арганізаваць кантрольны аддзел, увесьці бракераж, устанавіць фільтр-прэс і спэцыяльную пілку для рэзкі паперы.

Белапераараб'яднаньне і НК РСІ павінны прыняць рашучыя меры для палепшэньня якасьці шпалернай паперы, што выробляецца чашніцкай фабрыкай «Чырвоная зорка».

**ГАРЭЛАЎ.**

## ПА-БАЯВОМУ РЫХТАВАЦЦА ДА ТОРФСЭЗОНУ!

Вывезьці ўвесь загатоўлены торф.—Скончыць жыльлёвае будаўніцтва.—Забясьпечыць заводы патрэбнай рабочай сілай

### Па-новаму перабудаваць кіраўніцтва торфзаводамі

Пастаноўку «Напору» нельга разглядзець адным як раз зусім **заканчэнную**. «Напор» лічэ ў працэсе гарачай работы. І тэатр і аўтар п'есы пасьля сустрэчы новага пакаю, пасьля кожнай новай пастаўнай задачы рабочага гледача гарадзкіх фабрык і заводаў, уносяць новыя змены, новыя паправкі.

Але і сёньняшняя пастаноўка «Напору» выдзяляецца новым перамогаю БДТ-2 да яго пашчэпленага лёзунгу, бадзёрай жыцьцярадаснай пастаноўкаю. «Напор» може і павінен стаць глыбока пралетарскай пастаноўкай, рэвалюцыйнай эмацыянальна-эпаваой заходзі.

Для гэтага і тэатр і аўтар п'есы не павінны супакойвацца на дасягнутым, а як у песьні пастаноўкі шыць камсамольцы:

Поступам нашым нястрымным
Браць мы штодзённа вышыні! —

новыя вышыні на вялікіх барацьбы за сацыялістычную вытворчасьць, за Мацілёўцы пралетарскага мастацтва.

*Зьм. Паваротны*

## П'еса пра бадзёрасьць

### („Напор" Ан. Александровіча ў БДТ-2)

Сезон 1931-32 г. у рабоце дзяржаўных тэатраў БССР адзначаецца новым, крокам, якіх далёка недастатковым, крокам у стварэньні арыгінальнага пралетарскага рэпертуару. Другі Беларускі Дзяржаўны Тэатр, які цяпер працуе ў Гомелі, паставіў новую п'есу пралетарскага пісьма **Андрэя Александровіча — «Напор».**

П'еса «Напор» ўяўляе сабою палітычную дакладнасьць, як з пункту гледжаньня пастаноўкі не сакалістыкам БДТ-2, з пункту гледжаньня **ступені аўладаньня** тэатрам у сваёй рабоце творчым метадам **дыялектычнага матэрыялізму**, так і са сваім **літаратурным** тэкстам.

Андрэй Александровіч зьяўляецца адным з перадавых пралетарскіх пісьменьнікоў беларускай пралетарскай літаратуры. У беларускай пралетарскай пазэзіі Александровіч даў цэлы рад цікавых, сапраўдна-мастацкіх твораў. **«Цені на сонцы», «Паэма пра вораг», «Партыя кліча»**, і інш. увахоплівае у жалезны фонд пралетарскай пазэзіі апошніх год.

П'еса «Напор» — гэта першы драматургічны твор Александровіча. У гэтай «спробе» свае сілы ён пошаў па жанру галіне літаратурнага мастацтва, у гэтай «вылазцы» ў пралетарскую драматургію аўтар бліснула пазбегчы чэсных памылак і стварыць бадзёрую, сацыяльна-пазнавальную, рэвалюцыйна - заклікаючую п'есу.

І аўтар і тэатр сваю п'есу, сваю прем'еру прысьвячаюць ленінскаму камсамолу. «Напор» — першая пастаноўка з рэпертуару дзяржаўных тэатраў БССР, у якой так яна і глыбока пакасаецца бальшавіцкай моладзі, яе творчая работа на рэшткавых пазыцыях.

Тэма спектаклю, яго цэнтральная лінія, ідэя — гэтак таго, як работа арганізаваць, чырвонасьцяжны камсамол у будзях сацыялістычнага будаўніцтва, пад непасрэдным кіраўніцтвам камуністычнай партыі, аскальпаўляе, перавяраце ў пазітыўныя факты, у справу гонару, адвагі і гераізму шлях пра-

Сакрэтар шматтыражкі Міша Пачыян (актор **Ваніні**), камсамолец-ашыхолік Чыж (акт. **Ільінскі**), Вазьль (акт. **Матусевіч**), сакратар камсамольскага калектыву Стрэльбін і інш. — усё гэта ідэйныя ў п'есе тыпы камсамольцаў. І яны не абязьлічаны. Пры іх, як ногуцных вобразаў спектаклю, тэатр прэвялюць лінію п'есы, не ідэю.

Пэса пішэрна першам. Пры пастаноўцы «Напору» ад тэатру, і ў прыцяцьцяцьні ад рэжысэра тав. Міцкевіча, патрабавалася глыбокае ўменьне, вялікая «мера чуласьці», каб ужаваць голаса фарсажу і буфанадзіцца эстэцтва, каб на даль рытму і рэфрэн выявіць, абязьлічыць прыцяцьцяе і ідэйнае значэньне кожнага вобразу.

Пэны рад мясовых, цяжкіх п'есы (штыры дружбы, сацыяльнага) перакошваць у дружнасьці калектыву актораў, у вялікім яго майстэрстве. Афармленьне гэтых сцэн уцярпнаю ў практыцы работы дзяржаўных тэатраў БССР выражаецца праз колер. Заключнае вялікае п'есы — сацыявызыкаж — гэты сымбаль перамогі працы — арганізуе адрэзная бадзёрасьцю камсамольскай моладзі, эмацыянальнасьцю весьнавы-сеючых колераў.

Пастаноўка «Напору» — спектакль чысты пазаз. Музыка, сьпеў рытміка, сюжэт, рэфрэн вялікаюцца ў адну мастацкую лінію, у зьлітную суцэльную гаму.

«Напор» Смоспрэчна выдзяляецца новым **вышэйшым** этапам у рабоце БДТ-2 у змаганьні тэатру за сакраўды высока-мастацкі пралетарскі пазаз, за шкаю бальшавіцкай ідэйнасьці і ленінскай партыйнасьці.

П'еса Андрэя Александровіча «Напор» зьяўляецца новым ужыванам ва ўзрастаючы **пралетарскі сэктар** савецкай драматургіі БССР.

Але такая ацэнка **ні ў якой ступені** не кажа аб тым, што ў «Напору» няма сур'ёзных арыяў, вялікіх прамахаў, паасобных памылак ідэйна-палітычнага і творчага парадку.

«Напор» — бадзёры і радасны спектакль. Гэта, труба клічэ, — п'еса пра жыцьцёрадаснай бадзёрасьць нашай рабочай моладзі. Але БДТ-2 ідзе гэту лінію пастаноўку **не спасяцца** шчэ тэатрам **рэвалюцыйнай эпохі**. «Напор» **ня ўзьнімае** праблемы сацыялістычнага перабудаваньня мас, пытаньні адукацыйна тэхнікай, пытаньні камуністычных мэтадаў працы, **на ўзроўень высокай прынцыповасьці**.

І гэта не таму, што як аўтары рэжысэй на гэту пастаноўку ў «Пялесьні Прафдзе» цукаюць асобныя недахопы п'есы **у адсутнасьці моцнага сюжэтнага стрыжню**». Вызначаць і патрабаваць пейкі «сюжэты каноэ» ад драматурга і тэатру — абязьлічэнне фактам ужаскрэшчаньня старых пераможеных прынцыпаў і сьведчыць аб недастатковым творчым узроўні рэцэпцыі.

Ідэйна-клясавы бок мастацкага твору выяўляецца яго асновою, яго арганізуючым пачаткам. Драматург і тэатр маюць пераважальны творчы магчымасці ў выборы і вызначэньні сымвалы розначастных спосабаў і прыёмаў для найбольш поўнага і глыбокага ўскрыцьця гэтай ідэі праз мастацкія вобразы.

У «Напору» не паказана, адсутуча на заводзе, за кулісы роля старых кадравых рабочых у справе камуністычнага выхаваньня маладога пакаленьня. Сакратар партыйнага калектыву Кім (акт. **Сергейчык**) праходзіць у п'есе малапрыкметным, не стаіць на вышыні партыйнага апэратыўнага кіраўніцтва, не дае ўзораў работы па-новаму. Гэта ўдушчэньне ў п'есе зьяўляецца **сур'ёзнай памылкай палітычнага характару**.

З другога боку, нельга палітычную лінію вялікабальшавіка ленінскага камсамолу зьвяжыць, як гэта зроблена ў п'есе, з лініяй старой работніцы пасыльнай Мер'емы (акт. **Кашэльнікова**). І таму пастаўка заключных слоў у шкодзе сьветлагаціе — «Ці ня **бець лінія** старэнькай **Мер'емы** — лінія **камсамолу**!» — гучыць на сур'ёзна і выклікае **здзіўленьне**.

У «Напору» маюць сур'ёзнае месца элементы схематызму, асобна пры пазыцыі і ўскрыцьці стаючых вобразоў.

Пастаноўку «Напор» нельга разглядзець адным як раз зусім **заканчэнную**. «Напор» лічэ ў працэсе гарачай работы. І тэатр і аўтар п'есы пасьля сустрэчы новага пакаю, пасьля кожнай новай пастаўнай задачы рабочага гледача гарадзкіх фабрык і заводаў, уносяць новыя змены, новыя паправкі.

Але і сёньняшняя пастаноўка «Напору» выдзяляецца новым перамогаю БДТ-2 да яго пашчэпленага лёзунгу, бадзёрай жыцьцярадаснай пастаноўкаю. «Напор» може і павінен стаць глыбока пралетарскай пастаноўкай, рэвалюцыйнай эмацыянальна-эпаваой заходзі.

Для гэтага і тэатр і аўтар п'есы не павінны супакойвацца на дасягнутым, а як у песьні пастаноўкі шыць камсамольцы:

Поступам нашым нястрымным
Браць мы штодзённа вышыні! —

новыя вышыні на вялікіх барацьбы за сацыялістычную вытворчасьць, за Мацілёўцы пралетарскага мастацтва.

*Шырыць рады ўдарнікаў імя XIV і XVII*

# ЗА 15 ТАВАРНЫХ ПАРАСЯТ АД КОЖНАЙ СЬВІНАМАТКІ

## Заклік камсамольцаў саўгасу „Райцы" да ўсіх камсамольскіх ячэек, рабочай моладзі і сьвінароў сьвінагадоўчых саўгасаў БССР і Заходняй вобласьці

Рашаючая роля ў барацьбе за выпрацоўкі сьвіной праблемы належыць санылістычнай сьвінагадоўлі. Узмоцнена разгортваючы гэту галіну жывёлагадоўлі, мы здолеем у найкарацейшы тэрмін ліквідаваць нашы труднасьці, даць краіне таварнае мяса. Вось чаму ўсямернае разьвіцьцё саўгаснай і калгаснай сьвінагадоўлі зьяўляецца першачарговай задачай саўгасаў і калгасаў нашай краіны.

Перад саўгасамі БССР і Заходняй вобласьці партыяй пастаўлена адказьнейшая задача — даць у 1932 годзе краіне 218 тыс. таварных сьвіней. Гэта заданьне бязумоўна рэальна і можа быць выканана.

Наш саўгас **«Райцы»** (Талочынскага раёну) на працягу 1931 году меў значныя страты. Адыход шчаталоўя дасягаў ад 12 да 60 проц. Галоўнымі прычынамі страт былі цякучасьць рабочай сілы, абязьлічка і ўраўнілаўка, якія панавалі ў нашай гаспадарцы, адсутнасьць адказнасьці за даручаную справу.

Так працягвалася да сьлежня 1931 году, пакуль камсамольская ячэйка саўгасу, пад кіраўніцтвам партыкалектыву і пры дапамозе трыкутніка, не павяла рашучай барацьбы з усімі непаладкамі ў вытворчасьці, асабліва ў сьвінагадоўлі.

Камсамольцы, — брыгада за брыгадай, цэх за цэхам павялі наступленьне на абязьлічку, ураўнілаўку, пабаявому разгарнулі барацьбу за ліквідацыю цякучасьці рабочай сілы ў сьвінарніках, за ўкараненьне зоатэхнічнага мінімуму.

У цэху супаросных матак камсамольскія брыгады абвяшчаюць вайну брудзу і антысанітарыі. Стаўкі чысьцяцца на 2 разы ў дзень. Налажываецца правільны догляд і кармленьне матак, рэгулярны выпуск іх на прагулку.

У цэху маладняка, камсамольцы ня пусьцілі барацьбу за павялічэньне вагі кожнага парасяці і за кароткі перыяд дабіваюцца шэўных вынікаў. У спрэднім за месяц маладняк прыбывае ў вазе на 11 клгр.

На ініцыятыве камсамольскай ячэйкі племянны саўгас «Райцы» ператвараецца ў камсамольскі сьвінагадоўчы завод. Усе камсамольцы абвяшчаюць сябе ўдарнікамі і прымаюцца да сьвінаводу па два гады.

Ва ўсіх цэхах і брыгадах канчаткова ліквідуецца абязьлічка. Уся работа пераводзіцца на зьдзельна - прэміяльную і прагрэсыўную аплату. Пачынаецца ўпартая барацьба за большасныя і якасныя паказальнікі.

Камсамольскія брыгады бяруць на грамадзкі буксір будаўніцтва сьвінарнікаў. У выніку 9 сьвінарнікаў заканчваюцца да наступленьня калодаў. Усе сьвінарнікі ацеплены і падрыхтаваны да зімовых апаросаў.

Сьвінавод уступае на шлях укараненьня гаспадарчага разрахунку ў цэху, арганізуецца 7 гаспадарча-разрахунковых брыгад, якія дабіваюцца павялічэньня прадукцыйнасьці працы ў спрэднім на 30 проц. Зарплата сьвінара паднімаецца ў спрэднім з 45 да 72 руб.

Усе гэтыя мерапрыемствы хутка даюць адпаведныя вынікі — адыход сьвіней у саўгасе рэзка зьмяншаецца і за апошнія два месяцы (сьнежань-студзень) складае ўсяго 0,8 проц. План злучной кампаніі выканан на 98 проц.

Побач з ударнай работай на вытворчасьці, камсамольцы вядуць барацьбу за аўладаньне тэхнічнымі ведамі. Толькі нядаўна закончыліся курсы па тэхніцы сьвінагадоўлі, якія рэгулярна наведвалі 22 камсамольцы.

Учапочыўшыся ў конкурс «Правды» па лепшае арганізацыйна - гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, камсамольскія брыгады сьвінаводу дапамагалі трох падпэфным калгасам правільна паладзіць калгасную вытворчасьць і выканаць свае абавязкі перад дзяржавай.

У саўгасе палепшаецца і грамадзкае харчаваньне. Сталовая становіцца адным з важнейшых цэхаў сьвінаводу.

Так будуецца і мацнее першы ў СССР камсамольскі сьвінавод.

У чацьвертым заключным годзе пяцігодкі наш сьвінавод паводле прамфінпляну павінен даць краіне 300 племянных хракоў, атрымаць ад пакросу 2.633 парасят, захаваць на 6 парасят ад кожнай сьвінаматкі і давесьці стада пасьля сдачы прадукцыі да 1.268 шт.

Пастановы XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі і XIV зьезду КП(б)Б аб пабудове бясклясавага грамадзтва ў другой пяцігодцы абавязваюць нас з бальшавіцкай настойлівасьцю змагацца за налепшэньне снабжэньня рабочых, за поўнае выкананьне і перавыкананьне праграмы 1932 г. — чацьвертага, заключнага году першай пяцігодкі.

Мы, камсамольцы сьвінаводу шлем гасу «Райцы» пасьля дэтальнага абмеркаваньня прамфінпляну на нашых вытворчых нарадах, брыгадах, і цэхах высоўваем свой сустрэчны плян барацьбы за развіцьцё сацыялістычнай сьвінагадоўлі ў чацьвертым заключным.

Шляхам палепшэньня догляду, узьнімаюць кваліфікацыі сьвінара, поўнага ўжываньня зоатэхнічных і ветэрынарных правіл, мы абавязваемся выгадаваць на працягу году нямеркі 15 парасят ад кожнай сьвінаматкі, атрымаць за год 1.070 маладых племянных хракоў і матак зрыш вызначанага нам пляну, здаць дзяржаве 460 племянных хракоў, з якіх 50 проц. элітных, (першы гатунак), замест 300 вызначаных паводле пляну, вагой на 5 проц. 2-х месяцаў ня менш 25 клгр і 9 месяцаў ня менш 125 клгр.

Выкананьне гэтых абавязацельстваў можа быць забясьпечана толькі пры ўмове самага рашучага адпору буржуазна - рваціцкім тэндэнцыям, жорсткай барацьбы з усімі апартуністычнымі элементамі і рэалізацыі 6 гістарычных умоў т. Сталіна.

Мы абвяшчаем сябе ўдарнікамі імя XIV зьезду КП(б)Б і XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі і выклікаем на сацыялістычнае спаборніцтва па выкананьні гэтых паказальнікаў усе камсамольскія ячэйкі, рабочую моладзь і сьвінароў сьвінагадоўчых саўгасаў БССР і Заходняй вобласьці.

Камсамольцы-ўдарнікі сьвінаводу саўгасу «Райцы» заклікаюць на бальшавіцкую барацьбу за разгортваньне саўгаснай сьвінагадоўлі, за тое, каб 1932 г. — апошні год пяцігодкі ператварыць у год работы па-новаму сьвінагадоўчых саўгасаў і выкананьне імі сваіх абавязкаў перад дзяржавай.

Для праверкі выкананьня ўзятых на сябе абавязацельстваў, мы прапануем склікаць у кастрычніку 1932 г. другі міжкраявы сход ударнікаў сьвінагадоўчых саўгасаў.

Арбітрам міжкраявога спаборніцтва мы прапануем выбраць газэты «Зьвязда», «Рабочий путь», Сельско - хозяйственный рабочий» і «Сельгаспрабочы Беларусі».

Па даручэньні сьвінаводу племгасу «Райцы» камсамольская брыгада:

**Калін, Сідараў, Бірукова, Дунай, Аўчынка, Марозаў, Спатнай, Калініна, Жук.**

*АГЛЯД ДРУКУ*

# „З ВЫЯЗНОЙ СЭСІЯЙ РАЙСУДА..."

## („За калектывізацыю", Старадарожскі раён)

**ПА ВЫКАНАНЬНІ** збожжазагатоўчага пляну па самым апошнім месцы стаіць Старадарожскі раён. Ён рэалізаваў сваё гадавое заданьне ўсяго толькі на **48,7 проц.** (даныя на 5-га лютага). Ня гледзячы на катэгарычныя папярэджаньні з боку ЦК КП(б)Б і на зьмену парткіраўніцтва, мясцовыя арганізацыі не прынялі ніякіх мер да рашучага ўзмацненьня збожжазагатовак.

Віна за такое становішча ляжыць ня толькі на раённым кіраўніцтве, але і на рэдакцыі газэты **«ЗА КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЮ».**

Амаль у пачатку збожжазагатоўчай кампаніі (жнівень 1931 г.) «З. К.» пісала:

**«НАШ РАЁН МАЕ ЎСЕ МАГЧЫМАСЬЦІ, КАБ ПОЎНАСЬЦЮ І СВАЯЧАСОВА ВЫКАНАЦЬ ПЛЯН ЗАГАТОВАК. ДЛЯ ГЭТАГА ТРЭБА МАБІЛІЗАВАЦЬ УСЮ ПРАЛЕТАРСКУЮ ГРАМАДЗКАСЬЦЬ. ПАВЕСЬЦІ РАШЧУЮ БАРАЦЬБУ З САМАЦЁЧНЫМІ НАСТРОЯМІ, НЕ ДАПУСЬЦІЦЬ РАЗРЫВУ ПАМІЖ ЗАГАТОЎКАМІ І ВЫВАЗАМ».**

Хто-ж у першую чаргу павінен быў «мабілізаваць усю пралетарскую грамад

# У імя „парадку і цывілізацыі“

ЧАПЭЙ І УСУН АБЕРНУТЫ УГРУДЫ ПОПЕЛУ І РУІН; ВЁСКА УСУН ЗРАЎНАНА З ЗЯМЛЁЙ, УСЮДЫ ВАЛЯЮЦЦА ТРУПЫ; ТЫСЯЧЫ СЕМ'ЯЎ АСУДЖАНЫ НА ГАЛОДНУЮ СЬМЕРЦЬ

**ШАНХАЙ, 13.** Чапэй прадстаўляе сабою малюнак поўнага зьнішчэньня. Усюды відаць груды шэрага попелу і руіны. За выключэньнем некалькіх кварталаў Чапэй зусім апусьцеў. Толькі чарнеюць сьцены разбураных будынкаў. Раёны блізка ля паўночнага вакзалу, які быў нядаўна найбольш густа населенай часткай Чапэю, ператвораны ў пустое поле. Усюды валяюцца трупы загінутых ад бамбардыроўкі, голаду і пажару. Трупы можна бачыць на ўсіх вуліцах і перакрыжаваньнях. Трупы ня ўбіраюцца. Горад разбураецца далей ад страляніны, якая ня спыняецца.

Большасьць будынкаў Усуна разбураны. Пешаходы павінны карабкацца на сьцены дамоў, каб прайсьці ўперад. Усе ўрадавыя ўстановы, германскі унівэрсытэт разбураны да такой ступені, што іх наўрад ці можна будзе калі-небудзь аднавіць. Вёска Усун зусім разбурана. 30 дамоў зраўнаны з зямлёй. Вёска цяпер бязлюдная. Усе не жыхары эвакуяваліся.

## Пазыцыйная вайна ў Шанхаі

ШАНХАЙ, 11. Паводле паведамленьня «Шанхай Таймс» кітайскімі войскамі створана сыстэма вялікіх ізаляваных падземных умацаваньняў, сховаў, якія зьяўляюцца падзейнай абаронай. Па думцы ваенных спэцыялістаў, калі кітайцы будуць прытрымлівацца такога мэтаду абароны, дык ваенныя дзеяньні ператворацца ў пазыцыйную вайну. Фронт ужо зараз расьцягнуўся і падаўжаецца з кожным днём.

## Падрыхтоўка да абароны Кантону

ШАНХАЙ, 11. Ваенныя ўлады Кантону ўзмоцнена дыктуюцца да абароны Кантону і Гуандуньскай правінцыі на выпадак японскага ўварваньня ў паўднёвы Кітай. Чэн Цзі-тан (камандуючы войскамі гуандуньскай правінцыі) заявіў, што «армія будзе супраціўляцца любой спробе акупаваць Кантон». Паветраныя і морскія сілы займаюць такую-ж пазыцыю.

## На руінах Чапэю

ШАНХАЙ, 12. Хутка пасьля спыненьня варожых дзеяньняў перамір'е зноў было парушана. Японскія крыніцы заяўляюць, што кітайскія войскі парушылі згоду аб перамір'е, непарыўна абстрэльваючы японскія войскі, у той час, як японцы не адказвалі на агонь.

Аднак, з кітайскіх крыніц паведамляюць, што кітайскія салдаты прымушаны былі адкрыць агонь таму, што групы японскіх узброеных разьвядчыкаў прабавалі выкарыстаць перамір'е для таго, каб прабрацца ў Чапэй і што кітайскія войскі спынілі агонь, як толькі японскія разьвядчыкі адышлі назад. 2.000 бежанцаў эвакуяваліся з Чапэю ў часе перамір'я. **Большасьць кітайцаў адмовілася пераходзіць праз японскія лініі нават у прысутнасьці чыноўнікаў замежных улад, баючыся рэпрэсіі з боку японцаў.** Кітайскія дабрачынныя таварыствы арганізавалі ва многіх пунктах гораду лягеры для бежанцаў. Тысячы кітайцаў, пазбаўленых даху, спынілися тут. Яны жывуць поўнасьцю за кошт дабрачыннага таварыства, **страціўшы ўсё ў выніку бамбардыроўкі, пажараў і разбурэньня ў Чапэі.**

## Чан Кай-шы загадваездаць Шанхай !

ТОКІЕ, 11. Паводле паведамленьня агэнцтва «Дэмпо Пусін», Чан Кай-шы прапанаваў кітайскім ізючом у Шанхаі неадкладна спыніць ваенныя дзеяньні і прыступіць да дыпляматычных перагавораў з мэтай урэгуляваць шанхайскі інцыдэнт. Камандуючы кітайскімі войскамі ў раёне Шанхаю адмовіўся падпарадкавацца загаду Чан Кай-шы.

***

ШАНХАЙ, 11. Замежныя колы ўсяляк угаворваюць кітайцаў ні ў якім разе не пераступаць межаў сэтльмэнту і не пераходзіць у наступленьне супроць японцаў і ў крайнім выпадку весьці толькі абарончую барацьбу.

У кітайскіх колах разгалосьці. **Армія жадае перайсьці ў наступленьне, не зварачаючы ўвагі на перашкоды ў выглядзе замежных тэрыторый,** а палітэлічы вядуць перагаворы з прадстаўнікамі дзяржаў у Японіі ў падзеі ліквідаваць «інцыдэнт» шляхам кампраміса.

## Акупанты адчуваюць патрэбу аднавіць прэстыж

ЖЭНЭВА, 12. Як паказваюць у палітычных колах, Японія дала зразумець у Вашынгтоне, у Лёндане і Парыжы, што японскія войскі ў Шанхаі пацярпелі пакатэрую пяўдачу і што таму Японія адчувае патрэбу ў адпаўленьні свайго прэстыжу ў ваенным посьпеху. Пасьля дасягненьня гэтай мэты яна згодна «ўвайсьці ў разумо».

## Японцы рыхтуюцца да новага наступленьня

ШАНХАЙ, 11. Учарайшай бамбардыроўкай Чапэя зруйнаваны раён у 150 ярдаў даўжыні і 50 ярдаў шырыні. Такім чынам, падрыхтаваны вучастак для наступленьня японцаў. Перадаюць, што зруйнаваныя будынкі і паўкольныя дамы заняты кітайскімі снайпэрамі.

## 100 ваенных суднаў у Шанхаі

БЭРЛІН, 11. Паводле паведамленьня з Шанхаю, учора туды прыбылі два японскіх карабля і адзін амэрыканскі зьнішчальнік. Усяго ў шанхайскім порце 100 ваенных суднаў імпэрыялістычных краін.

## Гнеў працоўных мас нарастае

ШАНХАЙ, 12. Газэта «Шанхай Таймс» заяўляе, што дзесяткі тысяч рабочых, якія жывуць у сэтльмэнце, знаходзяцца без работы. **Незадаваленьне сярод рабочых шпарка разьвіваецца.** Дзесяткі тысяч бежанцаў з Чапея і Хонкю, многія з якіх галадаюць, нагнетаюць сур'ёзнасьць становішча. **Жыцьцё гораду дэзарганізавана.** Ужо з 23 студзеня зусім замерла кітайскае гандлёвае жыцьцё, бо многія фабрыкі і заводы зруйнаваны японцамі, а рэшта спыніла работу ў выглядзе пратэсту. Колькасьць беспрацоўных — **ня менш 500 тысяч.** Цэны на рыс і на іншыя прадукты харчаваньня растуць. Патрэба вялізарнейшая, **многія кітайцы літаральна гала даюць.** (ТАСС).

## Бамбардыроўка санітарных цягнікоў

ЛЕНДАН. Шанхайскі карэспандэнт «Дэйлі Геральд» апісвае паветраную бамбардыроўку ў Шанхаі. Ніжа лётаўшыя японскія самалёты скінулі некалькі бомбаў вагой **у 300 кгр. кожная ў стаўшы на станцыі пад парамі цягнік, поўны параненых кітайскіх салдат.** Груды цел, людзі і коні ўзьляцелі ў паветра, разам з кавалкамі разьбітых вагонаў. Японскі самалёт, які спусьціўся да памяшканьня кітайскага штабу на адлегласьць 300 мэтраў, быў абстрэлен кітайцамі, выпусьціўшымі паток сьвінцу са стрэльбаў і зэнітных гарматаў. Японскі пілёт быў забіт у сваёй машыне. Аэраплан упаў і пры паданьні ўзарваўся. На месцы выбуху на адлегласьці 200 крокаў ад штабу аказалася 16 забітых.

*П. Андроўскі*

# ЯПОНА-КІТАЙСКАЯ ВАЙНА

У той час як у Жэневе з усім выключнай урачыстасьцю адбываюцца пасяджэньні Міжнароднай канферэнцыі «па разбраеньні», на Далёкім Усходзе, у Манчжурыі і ў Шанхаі ўсё мацней і мацней разрастаецца грукат гарматных канонаў. У Жэневе сабраліся прэм'ер-міністры і кіруючыя члены ўрадаў усіх краін сьвету для таго, каб, нібы-та «змагацца» з небясьпекай новых войнаў. На Жэнэўскай канферэнцыі гавораць і будуць яшчэ на працягу раду месяцаў гаварыць салодкія прамовы аб неабходнасьці «абмежаваньня» ўзбраеньняў, аб пажаданасьці «зьмяншэньня» жахаў вайны, аб тым, каб забараніць найбольш бесчалавечныя, найбольш зьверскія мэтады зьнішчэньня людзей, як-та атрутныя газы і іншыя атрутныя матэрыі, навістрэныя бамбардыроўкі населеных цэнтраў, якія ня маюць цытадэлей і інш.

А ў гэты самы час японская багаторэ разбурваюць да нічэму кітайскую частку Шанхаю — Чапэй і раўнаюць з зямлёю порт Усун. Японскія ваенныя самалёты скідваюць бомбы над Шанхаем і над Нанкінам. У той час як у залах Жэнэўскай канферэнцыі крыва пушка дэклямуюць аб тым, што неабходна зрабіць вайну больш «гуманітарнай», японскі імпэрыялізм цае бліскучы доказ таго, што «права вайны» зрабіла значны прагрэс у іншым напрамку. Японская ваенчына паказала, што з гэтага часу можна вазяць самым сапраўдным чынам, ня лічачы нават з тымі фармальнасьцямі, якія некалі лічыліся абавязковымі, а ісьціна без абвяшчэньня вайны.

Адным з характэрных рысаў, унесенай падзеямі ў Манчжурыі і ў Кітаі ў малюнак міжкароднага жыцьця імпэрыялізму, зьяўляецца іменна той факт, што японскі імпэрыялізм вязе самую сапраўдную вайну на кітайскай тэрыторыі без таго, каб японскія імпэрыялісты і іншыя дзяржавы разглядалі гэта як вайну. Зьдзіўляецца, Японія-ж, як і ўсе іншыя гаварыя дзяржавы падпісала выдатны пакт Келёга «аб забароне вайны, як зброі нацыянальнай палітыкі.» Ці можа Японія прыпнаць, што сваім разбойніцкім нападам на Кітай яна парушыла пакт Келёга? Зразумела, не. І японская дыпляматыя з нагласьцю, якая сьведчыць аб тым, што японскія імпэрыялісты сапраўды ні ў чым ня ўстрачаюць сваім эўрапейскім і амэрыканскім калегам абвяшчае, што за пакт Манчжурыі, бамбардыроўка Шанхаю, Нанкіну і інш. гэта толькі «меры паліцыі», якія маюць на мэце абарону інтарэсаў японскіх грамадзян, якія жывуць у Кітаі, і, якія пібыта, прыпісваюцца кітайскімі ўладамі.

Мы ўжо паказвалі раней, што ў сваім піратскім палёце, Японія мела магчымасьць абапірацца на простае падтрымканьне Лігі нацый і французкага імпэрыялізму, і на натуральнае амэрыканскага і ангельскага імпэрыялізмаў. У асноўным становішча не змянілася і на сёньняшні дзень. Аднак, японскі напад на Шанхай і прасякненьне японскага імпэрыялізму ў далёкі ракі Янцзы ўносіць новыя элемэнты ў становішча на Далёкім Усходзе.

Як вядома, тактыка гаміндзанаўскага ўраду на ўвесь час канфлікту была такой-жа здрадніцкай ў адносінах да інтарэсаў працоўных мас Кітаю, якія стогнуць пад ярмом імпэрыялістаў, якой яна была за ўвесь час захаваньня ўлады Гаміндану. На японскі напад на Шанхай гамінданаўскі ўрад адказаў тэй-жа тактыкай «несупраціўленьня», якую ён практыкаваў у сувязі з акупацыяй Манчжурыі. Тым ня менш японская ваенчына сустрэла ў Шанхаі **вялізарнай сілы супраціўленьне, стыхійна арганізаванае шырокімі масамі, да якіх далучыліся вайсковыя часьці.** Без усялякага распарадкаваньня панкінскага ўраду, наперакор яго дырэктывам, народныя масы Шанхаю аказалі шалёнае супраціўленьне японскай ваенчыне і нанесьлі ёй буйныя страты.

Такое разьвіцьцё падзей зьявілася відавочна, поўнай нечакапасьцю для японскіх мілітарыстаў, якія разьлічвалі зняйсьці ў Шанхаі такія-ж тапныя лаўры, як у Манчжурыі. Тактыкай кароткага ўдару па Шанхаі японская ваенчына разьлічвала зламаць супраціўленьне кітайскіх народных мас і набіцца спынення стыхійна-ўзрастаючага антыяпонскага руху байкоту, які наносіць вялікарныя страты японскаму гандлю. Разам з тым японскі рух на Шанхай прадстаўляе сабою хітры манэўр, з прычыны якога адна буржуазная газэта сказала, што японцы выкарыстоўваюць момант, каб пабраць нагчыма больш з тым, каб пасьля было з чаго ўступаць. Вельмі магчыма, што японцы разьлічвалі адцягнуць увагу ад Манчжурыі з тым, каб пасьля, за выхад з Шанхая лягчэй набіцца прызнаньня капчатковага захопу Японіяй усёй Манчжурыі.

Вельмі моцнае супраціўленьне, якое японцы сустрэлі ў Шанхаі, аднак, значна ўскладняе становішча і зацягвае японскую гульню. Выйсьці зараз з Шанхаю, дзе японская ваенчыне прышлося атрымаць даволі моцныя ўдары, азначала-б прызнаць сваё паражэньне, што, зразумела, нанесла-б непапраўную страту японскаму «прэстыжу» і ўзьняла-б народныя масы Кітая на далейшае яшчэ больш упартае супраціўленьне.

З другога боку, зьяўленьне японскіх узброеных сіл у вусьці і ў далёкіх ракі Янцзы выклікае абвастрэньне сучэрочнасьцяй паміж японскім імпэрыялізмам і іншымі імпэрыялістычнымі дзяржавамі, Англіяй і Амэрыкай, якія маюць у гэтым раёне буйнейшыя інтарэсы. Праўда, і Англія і Амэрыка заваляваюцца больш плятанічнымі гостамі пратэсту, і бацца перайсьці да рашучых дзеяньняў супроць Японіі. Гэта тлумачыцца з аднаго боку цяжкім эканамічным становішчам гэтых краін і страхам яшчэ больш пагоршыць гэта становішча. Гэта тлума чыцца, па-другое, страхам, што сутычка паміж імпэрыялістамі на Далёкім Усходзе дае штурмок вызваленчаму руху кітайскіх народных мас і разьвяжа сілы сацыяльнай рэакцыі ў Кітаі. Нарэшце, ангельскі, і ў незалежнасьці амэрыканскі імпэрыялізм паранейшаму робяць стаўку на справакаваньне ваенных сутычкі паміж Японіяй і СССР, спадзяючыся, што такая сутычка дазволіць ім адным махам забіць двух зайцоў: сарваць ажыцьцяўленьне сацыялістычнай пяцігодкі і аслабіць Японію.

Вельмі магчыма, што намаганьні найбольш зацікаўленага на гэтай стадыі амэрыканскага імпэрыялізму будуць накіраваны да таго, каб прымусіць японскую ваенчыну выйсьці з Шанхаю і далей Янцзы і ласіраваць сваю актыўнасьць выключна ў бок Манчжурыі і ў бок савецкіх межаў. За выхад з Шанхаю амэрыканскія імпэрыялісты аўотна датуць Японіі поўную свабоду дзеяньняў і нават падтрымканьне ў Манчжурыі і супроць СССР.

Вось чаму, чым больш ускладняецца і заблытваецца вузел імпэрыялістычных супярэчнасьцяй на Далёкім Усходзе, тым больш гэта абавязвае нас да самай вялікай пільнасьці і да самай вялікай настарожанасьці, з тым, каб у любы момант магчы ў поўнай баявой гатоўнасьці сустрэць і адбіць спробу пазага ўсходняга нападу на краіну сацыялістычнага будаўніцтва.

# Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

## Выкананьне прамфінпляну прамысловасьці БССР за студзень 1932 г.

**Прамысловасьць ВСНГБ выканала прамфінплян за студзень 1932 г. на 76,2 проц. Тарфяная прамысловасьць выканала 42,4 вытворчай праграмы, мэталапрацоўчая—71,2 проц., у тым ліку па машына-будаўніцтве—89 проц., па с.-г. машынабудаўніцтве—52,8 проц; хімічная прамысловасьць—88,5 проц; прамысловасьць па вырабе будаўнічых матар'ялаў — 99,4: керамічныя заводы далі 55,1 проц., фанэрныя—108,8 проц; гарбарная прамысловасьць выканала студзеньскую праграму ў разьмеры 105 проц; папяровая—62 проц; шкляная—103,7 проц; тэкстыльная — 47,5 проц; абутковая—74,4 проц; шэйная—76,6 проц; запалкавая—96,2 проц.**

**Такім чынам, перавыканалі прамфінплян гарбарная і шкляная прамысловасьці. Набліжаюцца да выкананьня вытворчай праграмы прамысловасьць па вырабе будаўнічых матар'ялаў і запалкавая вытворчасьць.**

**Невыкананьне прамфінпляну за студзень тлумачыцца, галоўным чынам, нездавальняючай рэалізацыяй 6 умоў тав. Сталіна. У вельмі значнай меры на выкананьні пляну адбілася позьняе давядзеньне кантрольных лічбаў да прадпрыемстваў, што тармозіла масавую прапрацоўку заданьняў і разгортваньне сустрэчных плянаў.**

## Магнітагорская домна дае высокаякасны чыгун

**МАГНІТАГОРСК, 12.** У сувязі са скапчэньнем першай дэкады работы Магнітагорскай домны № 1, карэспандэнт «РОСТА» зьвярнуўся да члена ўрадавай камісіі па прыёмцы магнітагорскага і кузьнецкага заводаў інжынэра Сьвіцына з пытаньнем аб ацэнцы мінулай дэкады эксплёатацыі.

— Задуўка печы,—заявіў інжынэр Сьвіцын, — была праведзена вельмі цяжкіх умовах магнітагорскай імы. Перад магнітагорскімі доменшчыкамі стаялі зусім новыя праблемы —як будзе гарэць кокс з кузьнецкага вугалю ў печы аб'ёмам 1.200 кбм., як будзе адпаўляцца на гэтым коксе руда. У выніку задуўка дала станоўчыя вынікі. Атрыман ліцейны чыгун высокай якасьці. Аналіз, паказаўшы ў чыгуне 3 проц. крэмнія і ўсяго 0,03 проц. серкі дазваляе аднесьці чыгун да маркі 0—вышэйшай маркі ліцейнага чыгуну. Пасьля пуску выявіўся ад дробных дэфэктаў мантажу, недакладнасьці паасобных частак і невытарчальная падрыхтоўка кадраў. У выніку было некалькі аварый, якія крыху адтэрмінавалі разгортваньне нармальнай выплаўкі чыгуну. Зараз непаладкі ліквідаваны. Большасьць мэханізмаў працуе выключна выразна (водная газаачыстка і г. д.). Іншыя патрабуюць далейшага ўдасканаленьня (апаратура каўпараў, загрузачны апарат, сыстэма ахладжэньня горну).

У канцы гутаркі інжынэр Сьвіцын прывёў погляд віцэ-прэзыдэнта амэрыканскай фірмы Мак Хэйвіна. «Зьдзіўлен сьмеласьцю і настойлівасьцю, з якімі ў такіх цяжкіх умовах печ уведзена ў эксплёатацыю. Упэўнен, што ў найкарацейшы тэрмін домнішчыкі перамогуць усе трудасьці і наладзяць бліскучую работу печы».

Выпікі першай дэкады поўнасьцю апраўдваюць гэту заяву.

## Скончана пабудова новай домны

**КАНСТАНТЫНАЎКА, (Данбас), 11.** Домна № 2 заводу імя Фрунзэ ў аспоўным скончана. Раніцою 11 лютага пушчана першая пара. Капальня гатова і праверана пускавой камісіяй.

## На рашаючых вучастках

**ВУГАЛЬ.** 10 лютага па ўсім Саюзе здабыта 189.427 тон вугалю.

11 лютага па Данбасе здабыта 135.956 тон вугалю.

**ТРАКТАРЫ І АУТА-МАШЫНЫ.** 10 лютага сталінградзкім трактарным заводам выпушчана 130 трактараў.

Харкаўскім трактарным выпушчана 50 трактараў. Завод імя Сталіна (АМО) выпусьціў 10 лютага 40 аўта-машын.

**МЭТАЛЬ.** За 9 лютага на ўсіх мэталюргічных заводах Саюзу выплаўлена 14.550 тон чыгуну і 13.691 тона сталі (без малой мэталюргіі).

**Лесапіленьне**

За 10 дзён лютага Нова-Барысаўскім камбінатам «Камінтэрн» па лесапіленьні выпрацавана 1.545 кбм., або 80,67 проц. пляну, па фанэры—308,6 кбм.—72,6 проц. пляну.

## На добрускай папяровай фабрыцы

12 лютага на добрускай папяровай фабрыцы «Герой працы» працавала 6 машын. Папэры выпрацавана 55.532 кгр., або 77,3 проц. сутачнага заданьня. Прастой машын—47 гадзін. Торфу падана 248 тон.

## Выналходка перасьцераігальных апаратаў

КАДЗІЕЎКА. Перасьцерагальныя апараты (росьпіратары), якія даюць магчымасьць ратавальным камандам у часе ліквідацыі катастрофы ў капальні працаваць ва ўдушлівай атмасферы, да гэтага часу ўвозіліся з Германіі. Зараз начальнік раённай горнай ратавальнай станцыі тав. **Варэтчанка** распрацаваў канструкцыю савецкага ратавальнага апарату. Выпрабаваньне паказала, што гэты апарат лепш замежнага і, апрача таго, танэй і не патрабуе імпартных дэталяй. У 1932 годзе такіх апаратаў будзе прачан